**І. М. Ткачова,**
настаўніца беларускай мовы і літаратуры 1 катэгорыі
гімназіі г.Быхава

# Тэставыя заданні па беларускай мове
# 9-11 класы

Дадзеныя тэставыя заданні прызначаны для праверкі ведаў вучняў 9 – 11 класаў. У тэставай рабоце правяраецца пісьменнасць, культура мовы і веданне граматыкі і стылістыкі беларускай мовы. Заданні тэсту адпавядаюць наступным раздзелам курса беларускай мовы: «Арфаэпія і арфаграфія», «Лексіка і фразеалогія», «Марфалогія і арфаграфія», «Сінтаксіс і пунктуацыя».

Тэставыя заданні даюць магчымасць выявіць прабелы ў ведах вучняў. Так, заданні па арфаэпіі і фанетыцы дапамогуць усвядоміць спецыфіку вуснага маўлення, арфаграфічныя заданні будуць спрыяць павышэнню граматнасці падчас перадачы вуснай мовы на пісьме, заданні па лексікалогіі, фразеалогіі і культуры мовы раскрываюць невычэрпныя багацці нашай лексікі, у якой фіксуюцца традыцыі, звычаі, уклад жыцця нашых продкаў.

Тэст складзены на ўзор тых, якія выкарыстоўваліся на цэнтралізаваным тэсціраванні ў мінулыя гады, таму праца з ім будзе садзейнічаць падрыхтоўцы да экзамену і да тэсціравання.

Работу з тэстам варта ажыццяўляць у наступным парадку. Неабходна ўважліва прачытаць заданне, выбраць правільны варыянт адказу і адзначыць нумар гэтага адказу. Вельмі важна навучыць дзяцей правільна размяркоўваць час на выкананне заданняў, умець пераключаць увагу з адной тэмы на другую.

Тэст складаецца з дзвюх частак, у якія ўваходзяць заданні розных узроўняў складанасці. У першай частцы выкарыстоўваюцца заданні закрытага тыпу (даюцца варыянты адказаў, а вучні выбіраюць правільны адказ) і адкрытага тыпу (вучні самі запісваюць адказ).

Паспяховасць выканання тэставых заданняў забяспечваецца правільным падыходам да выкарыстання сваіх ведаў, уменняў, а таксама псіхалагічных рэсурсаў.

# Праверачны тэст па беларускай мове

## Частка А

А 1. Адзначце правільна затранскрыбіраваныя словы.

1) Перад хатай - [п‘эрат хатай];
2) Падлеткі - [патл’этк’і];
3) Распісаць - [рас’п’ісац’];
4) Кліент - [к’л’ійэнт];
5) Адцадзіць - [аццадз’іц’].

А 2. Адзначце словы, у якіх вымаўляецца падоўжаны гук [ц]:

1) Смецце;
2) Адцадзіць;
3) Дваццаты;
4) Адценне;
5) На кладцы.

А 3. Адзначце словы, у якіх пішацца - ў - :

1) Андэгра…нд;
2) Брантаза…р;
3) Кансілі…м;
4) А…тсайдэр;
5) Магутнае “ура”.

А 4. Адзначце словы, у якіх пішацца мяккі знак:

1) Хатын…скі;
2) Па шчырас…ці;
3) Кімс…ці;
4) Студзен…скі;
5) Вас…мю.

А 5. Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:

1) Садружнасць /Н, н/езалежных /Дз, дз/яржаў;
2) Казімір /Ч,ч/ацвёрты Ягелончык;

3) /П, п/аўночная Асецiя;
4) племя /К,к/рывiчы;
5) /Д, д/экан факультэта.

А 6. Адзначце словы, якiя пiшуцца разам:

1) Паў / лiмона;
2) Па / роўну;
3) Па / латынi;
4) Па / асобку;
5) Як / раз.

А 7. Адзначце няправiльна напiсаныя прыметнiкi:

1) Купалаўская прэмiя;
2) Валодзiн бацька;
3) мiнiяцюрны набор;
4) Гродзеньскi раён;
5) нарвескiя лясы.

А 8. Адзначце няправiльна напiсаныя лiчэбнiкi:

1) восемсот;
2) шасцiсотгодздзе;
3) сямiдзесяццюпяццю;
4) пад дзвюмя лiпамi;
5) пяцярымi кацянятамi.

А 9. Адзначце дзеясловы, якiя не маюць формаў цяперашняга часу:

1) смяяцца;
2) рвецца;
3) iмкнуцца;
4) запiсаць;
5) схапiць.

А 10. Адзначце словы, у саставе якiх няма канчаткаў:

1) далёкая;
2) выразаюць;
3) дзень;
4) прыгожа;
5) маляваць;

А 11. Адзначце словазлучэннi, дзе часцiца **не** пiшацца асобна:

1) /не/ вымытае курсантамі памяшканне;
2) стаяць /не/ высока, а нізка;
3) /не/ дамовіўшыся пра сустрэчу;
4) /не/ спаленае пілаванне;
5) папярэдзілі /не/ кага.

А 12. Адзначце словазлучэнні, у якіх падкрэслены галоўныя словы:

1) чатыры дзяўчынкі;
2) у пятнаццатым стагоддзі;
3) без дваццаці старонак;
4) да мільёна рублёў;
5) на пяці пальцах.

А 13. Адзначце прыказкі, дзе прапушчаны працяжнік:

1) Запас есці не просіць.
2) Не печ корміць а рукі.
3) Гаспадарку весці не кашу есці.
4) Хто  не дбае той нічога не мае.
5) Хмары не будзе гром не ўдарыць.

А 14. Адзначце лічбы, на месцы якіх павінны быць знакі прыпынку:

Нерухома стаяў густы (1) амярцвелы лес (2) шчыльна прытуліўшы верхавіны да верхавін (3) пераплёўшы галіны. Ні звер, ні чалавек (4) не парушалі яго ранішняга спакою. Толькі дзесь (4) у гушчары суха палукваў мароз(5) пераскокваючы з дрэва на дрэва. Пацяты марозам (6) снег хрустка рыпеў пад нагамі дзеда Талаша і Мартына Рыля. (Я.Колас)

А 15. Адзначце, у якіх радках з верша Якуба Коласа “Слова” не хапае косак:

1. Слова – радасць, слова – чары,
2. Вобраз вечна юных вёсен,
3. Ёсць ты ўсюды: у сонца  у хмары,
4. Ты глядзіш праз неба просінь.
5. Лашчыш слых мой  слова ззянне,
6. Атуляеш сэрца ласкай,
7. Ноч і вечар, дзень, світанне,
8. Абняло ты  слова-краска.

# Частка В

В 1. Устанавіце адпаведнасць паміж пропускамі ў словах і літарамі, якія неабходна ўставіць:

А) Ні..чымная вячэра 1) літара **с**
Б) Неаб'е..джаны конь 2) літара **ш**
В) Палоль..чык градаў 3) літара **ж**
Г) Цера..палосіца 4) літара **з**
Д) Парэ..це хлеба 5) літара **шч**

В 2. Адзначце назоўнік, у спалучэнні з якім назоўнікам прыметнік **ціхі** заўсёды будзе пісацца з вялікай літары:

1) ветрык;
2) акіян;
3) хлопчык;
4) голас;
5) натоўп.

В 3. Выберыце патрэбныя прыметнікі і запішыце з прапанаванымі назоўнікамі:

1) каўнер (вавёрчын, вавёркавы);
2) лыжы (Валодзевы, Валодзіны);
3) неба (зорчатае, зорнае).

В 4. Замяніце словазлучэнні аднаслоўнымі адпаведнікамі.

1) страфа з трох радкоў - ….;
2) тэрмін у дваццаць год - …;
3) прызначаны для дваіх - …;

В 5. Замест слоў, змешчаных у дужках, запішыце фразеалагізм з адпаведным значэннем:

Зоя Сцяпанаўна з абурэннем прамовіла: "Сярожа, ты павінен гэта ( *добра запомніць* )!"

В 6. Запішыце, як правільна закончыць фразу: *На ўроку настаўнік спытаў…*

1) Дваццаць дзвюх вучняў;
2) Дваццаць два вучні;
3) Дваццаць двух вучняў;
4) Дваццаць два вучня.

В 7. Запішыце, у якім жанры рэалізуецца публіцыстычны стыль:

1) пастанова;
2) заява;
3) паэма;
4) рэпартаж;
5) трагедыя.

В 8. Утварыце ад слова **чацвер** прыметнік. Запішыце ў пачатковай форме.

# Адказы

А 1 – 1, 3, 5;

А 2 – 2, 3, 5;

А 3 – 2, 4, 5;

А 4 – 3, 4, 5;

А 5 – 1, 3, 4;

А 6 – 1, 2, 4, 5;

А 7 – 2, 3, 4, 5;

А 8 – 2, 3, 4;

А 9 – 4, 5;

А 10 – 4, 5;

А 11 – 1, 2, 3;

А 12 – 2, 3, 5;

А 13 – 2, 5;

А 14 – 2, 3, 4, 5;

А 15 – 3, 5, 8;

В 1 – А2, Б4, В2, Г1, Д3;

В 2 – акіян;

В 3 – каўнер вавёркавы, лыжы Валодзевы, неба зорнае;

В 4 – трохрадкоўе, дваццацігоддзе, двухмесны;

В 5 – Зарубіць сабе на носе.

В 6 – дваццаць два вучні;

В 7 – рэпартаж;

В 8 – чацвярговы.